# Шляхамі памяці

**Напярэдадні свята Перамогі добрай традыцыяй для ветэранау педагагічнай нівы інавукі Першамайскага раёна стала наведванне памятных месцау, звязанных з ваеннай гісторыяй вызвалення Віцебшчыны ад нямецка – фашысцкіх захопнікау.**

Выязное пашыранае пасяджэнне прэзідыума ветэранскай арганізацыі «Залаты фонд» работнікау адукацыі і навукі Першамайскага раёна прайшло на базе аграгарадка Копці. Удзельнікі мерапрыемства наведалі воінскі мемарыяльны комплекс імя Ленінскага камсамола. Цёплае прывітанне гасцям копцінскай зямлі падрыхтавалі вучнімясцовай школы. Ветэраны паклалі кветкі на магілы вызваліцеляу. У якасці экскурсавода з цікавым аповедам пра ваенныя падзеі, якія закранулі гэты маляунічы край, выступіу ветэран Вялікай Айчыннай вайны падпалкоунік Віктар Цярэшчанка, які унёс вялікі уклад у стварэнне гэтага памятнага комплексу. Шмат у чым дзякуючы энтузіязму Віктара Дзям янавича, аб мемарыяле ведаюць далёка за межамі Беларусі.

Як адзначыу старшыня райкама прафсаюза работнікау адукацыі і культуры Першамайскага раёна Сяргей Нікіцін, мерапрыемтсва пакінула шмат уражанняу і добрых эмоцый. Для пакалення дзяцей вайны тэма гераічнага мінулага вельмі блізкая. Сярод іх шмат нераунадушных людзей, якія збіраюць каштоуны гістарычны матэрыял, вяртаюць невядомыя прозвішчы вызваліцеляу, вядуць патрыятычна – выхавайчую работу з маладым пакаленнем. Вельмі важна, каб гэтая сувязь заставалася такой трывалай і надалей.

**Андрэй Захарау.**
**Вечерний Витебск № 19**